УДК 355.233.231.1:821.161.3

# ВЫКАРЫСТАННЕ ЛІТАРАТУРНАГА МАТЭРЫЯЛУ ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

А. В. ШАРАПАВА
Беларуска-Расійскі ўніверсітэт
Магілёў, Беларусь

28 снежня 2023 г. была зацверджана Канцэпцыя развіцця нацыянальнай культурнай прасторы ва ўсіх сферах жыцця грамадства на 2024–2026 гады (далей – Канцэпцыя). Яе актуальнасць «абумоўлена неабходнасцю захавання адзінства беларускага народа і забеспячэння далейшай кансалідацыі беларускага грамадства, а таксама ўмацавання незалежнай беларускай дзяржавы і фарміравання нацыянальнага чалавечага капіталу» (тут і далей пераклад на беларускую мову аўтара – А. Ш.) [1]. Рэалізацыя задач Канцэпцыі павінна адбывацца ва ўсіх сферах жыцця беларусаў, асабліва ва ўстановах адукацыі. «У дзіцячых садках, школах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах фарміруецца духоўнае і маральнае аблічча нацыі. Каласальная адказнасць ляжыць на плячах выхавальнікаў, школьных настаўнікаў, выкладчыкаў ВНУ – захаванне пераемнасці нашых традыцыйных каштоўнасцяў. Галоўная ў іх – любоў да сваёй краіны» [2].

У шэрагу іншых вучэбных дысцыплін вышэйшай школы найбольшы выхаваўчы патэнцыял у дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага блока. Устойліва і нязменна ўваходзіць у вучэбныя планы ўсіх спецыяльнасцяў нефілалагічнага профілю дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)». Нездарма ў Канцэпцыі адзначана: «Беларуская мова прызнаецца адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту» [1]. На занятках па беларускай мове ў межах праграмнага матэрыялу заўсёды ёсць магчымасць узгадаць персаналіі выбітных пісьменнікаў, узяць прыклады з іх тэкстаў для практыкаванняў, актуалізаваць краязнаўчыя факты. У практыцы выкладання дысцыпліны для аналізу абіраецца творчасць пісьменнікаў-юбіляраў, пісьменнікаў-землякоў, што адпавядае мэтам практыкаарыентаванага навучання, дае магчымасць вырашыць пастаўленыя Канцэпцыяй задачы, яднае тэорыю і рэальнае жыццё.

У межах тэмы «Лексічная сістэма беларускай мовы» ў 2024 г. мэтазгодна выкарыстаць матэрыял, звязаны з жыццём і творчасцю Міхася Лынькова. Гэта абумоўлена наступнымі прычынамі: у гэтым годзе святкуецца 125-годдзе з дня нараджэння пісьменніка; многімі фактамі біяграфіі ён быў звязаны з Магілёўшчынай; яго творы – крыніца спецыяльнай лексікі. Інфармацыя мусіць быць пададзена блокамі ў адпаведнасці з планам заняткаў.

Так, у межах уступнай часткі можна: адзначыць, што скарбонкай лексікі беларускай мовы з’яўляецца творчасць пісьменнікаў, у тым ліку народнага пісьменніка БССР М. Лынькова; нагадаць, што дзяцінства і юнацтва пісьменніка прайшлі на чыгунцы, а ў 1905–1906 гг. Лыньковы жылі ў казарме паміж станцыямі Магілёў і Лотва. З мая 1925 г. яго накіравалі на працу сакратаром рэдакцыі акруговай газеты «Камуніст» (Бабруйск), у якой Лынькоў нарэшце стаў адказ-

ным рэдактарам. Цікава, што свой першы верш у пачатку 1921 г. ён надрукаваў якраз у гэтай газеце. У Бабруйску пісьменнік працаваў да 1930 г. За гэты час ён быў абраны членам прэзідыума, а з кастрычніка 1925 г. і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка», стаў членам Камуністычнай партыі, у 1926 г. ажаніўся з настаўніцай Х. А. Аранковай; запытаць, якія творы пісьменніка навучэнцам ужо вядомыя (у V класе для вывучэння рэкамендаваны апавяданне «Васількі», аповесць-казка «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў», для дадатковага чытання – аповесць «Міколка-паравоз»).

У межах тэмы «Тэрміналогія як вядучы складнік прафесійнага маўлення» і тлумачэнні новага матэрыялу мэтазгодна ў якасці ўзораў лексікі абмежаванага ўжытку прывесці прыклады з твораў пісьменніка: жарганізмы («Баян»), дыялектызмы («На чырвоных лядах»), спецыяльная лексіка: тэрміны і прафесіяналізмы («Андрэй Лятун», «Чыгунныя песні»). Апошняя група слоў можа стаць матэрыялам для вывучэння наступных праграмных пытанняў: спосабы і сродкі ўтварэння тэрмінаў розных галін дзейнасці; словаўтваральныя паказчыкі тэрмінаў; адаптацыя запазычаных тэрмінаў у беларускай мове.

На этапе рэфлексіі навучэнцам можна прапанаваць разгадаць крыжаванку, створаную на аснове тэрмінаў з лынькоўскіх твораў: стрэлка (прыстасаванне на рэйкавых пуцях для пераводу рухомага саставу з аднаго пуці на другі); счэпшчык (рабочы, які счэплівае вагоны); буфер (спецыяльнае прыстасаванне ў паравозах, вагонах, аўтамабілях для паслаблення сілы ўдару, штуршка пры сутыкненні); шпала (масіўны папярочны драўляны або жалезабетонны брус, на яго ўкладваюць рэйкі); мазут (астаткі ад нафты пасля адгонкі з яе бензіну, газу і газаліну); рэйка (на чыгуначным пуці: вузкі стальны брус, па якім коцяцца колы цягніка); рэгулятар (прыбор для рэгулявання чаго-небудзь); семафор (сігнальнае прыстасаванне на чыгунцы, якое паведамляе, што пуць свабодны або заняты); кукушка (размоўная назва невялікага манеўровага лакаматыва (прафесіяналізм)); паравоз (лакаматыў з паравым рухавіком) і інш.

Падобныя формы працы спрыяюць дасягненню шэрагу адукацыйных задач, з’яўляюцца прадуктыўнымі ў працэсе фарміравання грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Концепция развития национального культурного пространства во всех сферах жизни общества на 2024–2026 годы [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22300961. – Дата доступа: 01.02.2024.

2. Послание Президента Республики Беларусь А. Г. Лукашенко белорусскому народу и Национальному собранию Республики Беларусь 31 апреля 2023 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://president.gov.by/ru/events/poslanie-aleksandra-lukashenko-belorusskomu-narodu-i-nacionalnomu-sobraniyu-sostoitsya-31-marta. – Дата доступа: 22.01.2024.